па стат. і дынамічнай устойлівасці збудаванняў.

*Тв.*: Нелинейное деформирование, статическая и динамическая устойчивость пространственных стержневых систем. Мн., 1999; Работа деформируемых систем при следящих, ветровых и гидростатических нагрузках // Механика разрушения композиционных материалов. Мн., 1997.



С.С.**Сідорскі**.



А.В.**Сінкевіч**.

**СІДО́РСКІ** Сяргей Сяргеевіч (н. 13.3.1954, г. Гомель), дзяржаўны дзеяч Беларусі. Д-р тэхн. н. (2003). Чл. Прэзідыума Нац. АН Беларусі (з 2003). Акад. Міжнар. інж. акадэміі (1999). Засл. работнік прам-сці Беларусі (1997). Скончыў Бел. ін-т інжынераў чыг. транспарту (1976). З 1976 на Гомельскім з-дзе радыётэхнал. аснашчэння: майстар цэха, нач. лабараторыі, аддзела, нам. дырэктара, з 1991 дырэктар завода. З 1992 ген. дырэктар навук.-вытв. аб'яднання «Ратон» (г. Гомель). У 1998—2001 нам., 1-ы нам. старшыні Гомельскага аблвыканкома. З 2001 нам., з 2002 1-ы нам., з 2003 в.а. Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. Са снеж. 2003 Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь. Асн. кірункі навук. дзейнасці: тэхналогія і перапрацоўка палімераў і кампазітаў.

*Тв.*: Технология вакуумной металлизации полимерных материалов. Гомель, 1994.

**СІМО́НЧЫК** Леанід Васілевіч (н. 1.12.1950, в. Манькавічы Столінскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1997). Скончыў БДУ (1973). З 1974 у Ін-це фізікі, з 1992 у Ін-це малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па фізіцы ўзаемадзеяння інтэнсіўных эл.-магн. хваль з неаднароднай плазмай, фізіцы газаразраднай плазмы, дыягностыцы плазмы. Устанавіў механізмы ўзбуджэння параметрычных няўстойлівасцей вымушанага рассеяння мікрахвалевага выпрамянення ў неаднароднай плазме, распрацаваў метады кантролю і кіравання імі.

*Тв.*: Экспериментальное исследование абсолютной параметрической неустойчивости неоднородной плазмы (у сааўт.) // Журн. эксперим. и теорет. физики. 1987. Т. 93, вып. 10; Experimental investigation of coherent parametric microwave absorption in magnetized inhomogeneous plasma ( у сааўт.) // Plasma Phys. Contr. Fusion. 1998. Vol. 40, № 2.

**СІМХО́ВІЧ** Валянціна Аляксандраўна (н. 22.3.1955, г.п. Глуск Магілёўскай вобл.), бел. сацыёлаг і філолаг. Д-р сацыялаг. н. (2003), канд. філал. н. (1986). Скончыла Мінскі пед. ін-т замежных моў (1977). Настаўнічала. З 1978 у Бел. эканам. ун-це, з 2003 дэкан ф-та менеджменту. Навук. працы па праблемах ідэнтыфікацыі і сацыялізацыі асобы, кіравання персаналам, па лінгвістыцы і методыцы выкладання замежных моў. Распрацавала тэарэтыка-метадалагічныя асновы сацыялагічнай канцэпцыі феномена карпаратыўнага чалавека, яго сацыялізацыі і ўзнаўлення японскім грамадствам як цэласнай і эфектыўна дзеючай сацыякульт. мадэлі (сям'я — школа — фірма).

*Тв.*: Практическая грамматика английского языка. Мн., 2001; Japanese Approach to Businesc: Managament System and Corporate Men. Tokyo, 2001; Феномен корпоративного человека в японском обществе. Мн., 2002.

**СІНІ́ЦЫН** Мікалай Васілевіч (н. 18.8.1935, в. Туркава Яраслаўскай вобл., Расія), расійскі і бел. вучоны ў галіне лугаводства. Д-р с.-г. н. (1984), праф. (1987). Засл. дз. нав. Расіі (1995). Скончыў Маскоўскую с.-г. акадэмію (1959). З 1966 у Бел. НДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі (у 1971—88 заг. аддзела). З 1990 у Смаленскім с.-г. ін-це (у 1990—2000 рэктар). Навук. працы па праблемах лугавой кормавытворчасці. Распрацаваў комплекс мерапрыемстваў па паляпшэнні лугоў на поймавых землях, прапанаваў спосабы фарміравання сеяных супольнасцей доўгагадовых сенажацей і выпасаў з высокай прадукцыйнасцю.

*Тв.*: Пойменные луга и их улучшение. Мн., 1972; Продуктивность пойменных лугов. Мн., 1987 (у сааўт.); Луговое кормопроизводство в Нечерноземной зоне. Смоленск, 2003 (у сааўт.). *В.М.Кандрацьеў.*

**СІНКЕ́ВІЧ** Аляксей Васілевіч (н. 10.6.1977, г. Віцебск), бел. спартсмен (гімнастыка спарт.). Засл. майстар спорту Беларусі (2001). З 1995 інструктар-спартсмен Мін-ва спорту і турызму Рэспублікі Беларусь. Чэмпіён свету (2001, г. Гент, Бельгія) у камандным заліку, сярэбраны (1997, г. Лазана, Швейцарыя) і бронз. (1999, г. Цяньцзінь, Кітай) прызёр у камандным заліку. Бронз. прызёр чэмпіянату свету (2002, г. Дэбрэцэн, Венгрыя) у асабістым заліку ў практыкаваннях на брусах. Бронз. прызёр чэмпіянату Еўропы (2000, г. Патры, Грэцыя) у камандным заліку і бронз. — у асабістым заліку (брусы). Бронз. прызёр Сусв. універсіяды (2001, Пекін; брусы). *А.А.Дубовік.*

**СІНЮ́ЦІН** Мікалай Пятровіч (26.10.1911, г. Рэчыца Гомельскай вобл. — 5.11.1941), Герой Сав. Саюза (1940). Скончыў ваен. пях. вучылішча (1936). У час сав.-фінл. вайны 1939—40 камандзір стралк. батальёна старшы лейтэнант С. вызначыўся 8—27.2.1940 пры ўтрыманні важных вышынь на Карэльскім перашыйку, дзе яго батальён адбіў некалькі контратак праціўніка. У Вял. Айч. вайну маёр С. на фронце, узначальваў асобны стралк. полк. Загінуў у баі.

**СІРАЦІ́НІН** Яўген Сяргеевіч (н. 31.1.1925, г. Чэрвень Мінскай вобл.), расійскі ваенны вучоны. Правадз. чл. акадэміі ваен. навук (1966), Рас. акадэміі касманаўтыкі (1998). Д-р тэхн. н. (1972), праф. (1979). Ген.-маёр-інжынер (1976). Скончыў Ваен. артыл. радыётэхн. акадэмію (1955). У 1942—88 ва Узбр. Сілах СССР. З 1957 у НДІ войск ППА (г. Калінін), з 1989 у Ваен. ун-це ППА (г. Цвер). Навук. працы па распрацоўцы і баявым выкарыстанні сродкаў і сістэм разведкі розных відаў. Удзельнічаў у распрацоўцы сістэм папярэджання аб ракетным нападзе, стварэнні першага радыёлакацыйнага комплексу і базавай радыёлакацыйнай станцыі папярэджання. Дзярж. прэмія СССР 1974. *М.М.Касцюковіч.*

**СКАРАПА́НАВА** Ірына Сцяпанаўна (н. 2.4.1945, Масква), бел. літаратуразнавец. Дачка С.Г.*Скарапанава.* Д-р філал. н. (2003). Скончыла БДУ (1967), з 1972 выкладае ў ім. Даследуе праблемы тэорыі л-ры, гісторыі рус. л-ры 20 ст., сучаснай рус. л-ры. Аўтар навук. прац і навуч. дапаможнікаў.

*Тв.*: Русская постмодернистская литература: новая философия, новый язык. 2 изд. СПб., 2002; Русская постмодернистская литература: Учеб. пособие. 4 изд. М., 2002.

**СКІ́БА** Пётр Аляксеевіч (н. 3.1.1946, в. Лявонавічы Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. фізік. Д-р тэхн. н. (2000). Чл.-кар. Бел. інж. акадэміі (2001). Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1969). З 1971 у Ін-це прыкладной оптыкі Нац. АН Беларусі. З 1996 у Магілёўскім ун-це харчавання. Навук. працы па структурна-фазавых зменах шклопадобных і полікрышт. аксідных матэрыялаў функцыян. прызначэння пры ўздзеянні лазернага выпрамянення, нізкатэмпературнай плазмы і эл. палёў. Удзельнічаў у распрацоўцы і ўкараненні новых тэхналогій і абсталявання для лазернага фарміравання мікрааптычных элементаў у інтэгральнай оптыцы і мікраэлектроніцы.

*Тв.*: Лазерная модификация стекловидных материалов. Мн., 1999; Некоторые особенности кристаллизации Ti-содержащего стекла под действием лазерного излучения (разам з У.П.Волкавым) // Весці Нац. АН Беларусі. Сер. фіз.-мат. навук. 1999. № 1.

**СКОРАБАГА́ТЧАНКА** Альбіна Васілеўна (н. 5.2.1949, г. Зілупе, Латвія), бел. этнамузыказнаўца, фалькларыст, педагог. Канд. мастацтвазнаўства (1995). Праф. (2003). Скончыла Бел. кансерваторыю (1973). З 1973 выкладала ў Маладзечанскім муз. вучылішчы, з 1977 — Бел. ун-це культуры, адначасова з 1982 арганізатар і кіраўнік вучэбнага інстр. ансамбля «Спадчына», у аснове якога традыцыі «траістай музыкі». Вывучае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

бел. інстр. фальклор. Аўтар манаграфій «Беларускі музычны фальклор: Інструментальная традыцыя» (кн. 1, 2; 1990), «Народная інструментальная культура беларускага Паазер'я» (1997), «Інструментазнаўства» (2000), «Беларускія народныя музычныя інструменты XX стагоддзя» (2001), навуч. і метадычных дапаможнікаў і інш.

**СЛО́ЦІН** (Slotin) Луіс Аляксандр (1.12.1910, г. Вініпег, Канада — 30.5.1946), канадскі фізік. Д-р філасофіі (1936). Бацькі паходзілі з г. Слаўгарад Магілёўскай вобл. Скончыў ун-т правінцыі Манітоба (1933) і Лонданскі ун-т (1936). З 1937 у Чыкагскім ун-це (ЗША). Навук. працы па радыялогіі. З 1942 удзельнічаў у Манхатанскім праекце па стварэнні амер. атамнай бомбы, узначальваў даследчую групу па вымярэнні *крытычнай масы* ядз. выбуховага рэчыва. У час аварыйнай сітуацыі ў чарговым эксперыменце для спынення ланцуговай ядз. рэакцыі рукамі раз'яднаў паўшар'і з плутонію і атрымаў смяротную дозу нейтроннага і гама-выпрамяненняў; праз 9 дзён памёр. Яго імем названа малая планета.

*Літ.:* Лэпп Р. Атомы и люди: Пер. с англ. М., 1959; Юнг Р. Ярче тысячи солнц: Повествование об ученых-атомниках: Пер. с англ. М., 1961. *М.М.Касцюковіч.*

**СЛУ́ЦКАЕ ЕВА́НГЕЛЛЕ**, бел. рукапісны помнік канца 16 ст. Напісаны ў 1582 у г. Слуцк (Мінская вобл.), відаць, кн. Юрыем Алелькавічам. Да 1917 захоўвалася ў Слуцкім Свята-Троіцкім мужчынскім манастыры. Да канца 1920-х г. у фондах Мінскага дзярж. музея, з 1929 — у Магілёўскім дзярж. музеі, адкуль знікла ў пач. Вял. Айч. вайны. У 2002 перададзена ў Бел. экзархат. Напісана царк.-слав. мовай уставам на 259 аркушах у 2 калонкі па 20 радкоў на чарпанай паперы. Мае каляровыя застаўкі. Пераплёт 19 ст. з кардону ў чырвоным аксаміце. На 1-м аркушы — запіс спавядальніка князя пратапопа Малафея.

*Літ.:* Древнерусский город Слуцк и его святыни: Ист. очерк / Сост. Серно-Соловьевич Ф.Ф. Вильно, 1896. С. 35; Снитко А.К. Описание рукописей и старопечатных книг в Слуцком (Минской губ.) Тройчанском монастыре // Изв. ОРЯС. 1911. Т. 16, кн. 1; Запісы БІНІМ. 1974. Кн. 12. С. 103; Katamajska-Saeed M. Portrety i zabytki książąt Olelkowiczów w Słucku: Inwentaryzacja Józefa Smolińskiego z 1904 r. Warszawa, 1996. S. 37. *Т.І.Рошчына.*



Старонка **Слуцкага Евангелля**. 1582.

**СЛЮНЬКОВА** Інеса Мікалаеўна (н. 9.8.1953, Мінск), бел. і рас. гісторык архітэктуры. Дачка М.М.*Слюнькова*. Д-р архітэктуры (2002). Вучылася ў БПІ (1970—73), скончыла Маскоўскі арх. ін-т (1977). З 1973 у Маскве. Працавала ў ЦНДІП горадабудаўніцтва, з 1984 у НДІ тэорыі архітэктуры і горадабудаўніцтва, з 1994 у Рас. акадэміі архітэктуры і буд. навук, НДІ тэорыі і гісторыі выяўл. мастацтваў Рас. АМ. З 2003 гал. архітэктар гіст.-культ. музея-запаведніка «Маскоўскі Крэмль». Даследуе дойлідства і горадабудаўніцтва 14—19 ст. Аўтар кніг «Архітэктура гарадоў Верхняга Прыдняпроўя VII — сярэдзіны XIX ст.» (1992), «Манастыры ўсходняй і заходняй традыцыі: Спадчына архітэктуры Беларусі» (2002), арт. «Праваслаўнае мастацтва Украіны і Беларусі XIV—XVIII стст.» у кн. «Праваслаўная энцыклапедыя: Руская праваслаўная Царква» (2000).

*Тв.:* Храмостроительство в России: Традиции и современность. М., 1996 (у сааўт.); Архитектура русской усадьбы. М., 1998 (у сааўт.); Проблемы воссоздания утраченных памятников архитектуры. М., 1998 (у сааўт.); Русская усадьба в старинной открытке: Альбом. М., 2003. *Т.Р.Мартыненка.*

**СЛЮ́САР** Мікалай Міхайлавіч (н. 25.9.1947, станіца Ольгінская Краснадарскага краю, Расія), бел. вучоны ў галіне радыёлакацыі. Палкоўнік (1988). Канд. тэхн. н. (1976). Праф. (1993). Чл. Міжнар. акадэміі інфарм. тэхналогій (1996). Засл. вынаходнік Беларусі (1988). Скончыў Мінскае вышэйшае інж. зенітнае ракетнае вучылішча ППА (1970), дзе і працаваў з 1973. З 1995 у Ваен. акадэміі Рэспублікі Беларусь. Заснавальнік і кіраўнік школы «Радыёлакацыйныя сігнатуры і радыёхвалевы маніторынг дынамічных аб'ектаў». Асн. кірункі навук. дзейнасці: рассеянне і паўторная мадуляцыя радыёхваль дынамічнымі аб'ектамі, радыёлакацыйнае распазнаванне і інш. Дзярж. прэмія СССР (1989). Залаты медаль ВДНГ СССР (1978). *Г.П.Маскін.*

**СМАЛЯ́К** Юрый Леанідавіч (12.4.1948, Мінск — 6.12.1995), бел. вучоны ў галіне фітапаталогіі і мікалогіі. Д-р с.-г. н. (1993), праф. (1994). Скончыў Бел. тэхнал. ун-т (1971), дзе і працаваў. З 1989 у Бел. НДІ эксперым. батанікі. Навук. працы па вывучэнні заканамернасцей пашырэння ў хвойных лясах Беларусі каранёвых гнілей і апенькі восеньскай, асн. шкоднікаў хвойных дрэў. Вызначыў асн. прыродныя і антрапагенныя фактары, што ўплываюць на пашырэнне хвароб у хвойных лясах і інш.

*Тв.:* К характеристике плодоношения опенка осеннего // Лесоведение и лесное хозяйство. 1978. Вып. 13; Оценка методов учета очагов корневой губки в сосновых насаждениях (у сааўт.) // Лесоведение и лесное хозяйство. 1989. Вып. 24.

**СМАЛЯНЧУ́К** Аляксандр Фёдаравіч (н. 23.5.1959, г.п. Казлоўшчына Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (2003). Скончыў Гродзенскі ун-т (1981). Настаўнічаў, працаваў у Рэсп. музеі гісторыі рэлігіі, гродзенскім абласным гісторыка-археал. музеі, ін-це павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, Гродзенскім ун-це. З 2003 у Беларускім ін-це правазнаўства. Даследуе гісторыю нац. руху ў Беларусі і Літве, паліт. гісторыю 20 ст.

*Тв.:* Палякі Беларусі і Літвы ў рэвалюцыі 1905—1907 гг. Гародня, 2000; Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй: Пол. рух на бел. і літ. землях, 1864—1917. Гродна, 2001.

**СМІРНО́Ў** Анатоль Іванавіч (6.5.1920, в. Сцяпурына Іванаўскай вобл., Расія — 1.6.1986), расійскі і бел. вучоны ў галіне аўтаматызацыі кіравання. Д-р тэхн. н. (1972), праф. (1976). Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1938—41). Скончыў Ленінградскую інж. ваенна-паветр. акадэмію (1946). З 1974 у Маскоўскім інж.-буд. ін-це (з 1975 заг. кафедры). З 1980 заг. кафедры Мінскага радыётэхн. ін-та. Навук. працы па асновах дыскрэтнай матэматыкі, пабудовы АСК і метадах аналізу іх надзейнасці. Распрацаваў метад логіка-тапалагічнага мадэліравання складаных сістэм.

*Тв.:* АСУ в строительстве. М., 1979. *У.С.Муха.*

**СМО́ЛЬСКІ** Станіслаў Станіслававіч (н. 6.1.1955, в. Хадзюкі Лідскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. ваен. дзеяч. Ген.-м. (2003). Скончыў Ташкенцкае вышэйшае агульнавайск. каманднае вучылішча (1976), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1987), Ваен. акадэмію Генштаба Узбр. Сіл Рас. Федэрацыі (1995), Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (2003). З 1976 на камандных і штабных пасадах у БВА, з 1977 у Далёкаўсходняй, з 1987 у Прыбалт. ваен. акругах. З 1992 на розных пасадах ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь, у т.л. ў 1995—96 і 2000—01 у Ваен. акадэміі Рэспублікі Беларусь. У 1996—98 і 2001 у Гал. штабе, у 2001—2003 1-ы нам. нач. Генштаба Узбр. Сіл Рэспублікі Беларусь. З 2.7.2003 камандуючы Сухап. войскамі Узбр. Сіл Рэспублікі Беларусь.

**СНЫТКО́** Валерыян Апанасавіч (н. 18.1.1939, г.п. Бялынічы Магілёўскай вобл.), расійскі вучоны-географ; пачы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ